# СВАБОДА

№13 6 — 11 красавіка 1994 г.

Кошт 100 рублёў

ГОД ЗАСНАВАНЬНЯ 1902
ВЫХОДЗІЦЬ З 1990

Галоўны рэдактар **Ігар ГЕРМЯНЧУК**

Заснавальнік **Павал ЖУК**

Выдавец
**«Газэта СВАБОДА», Ltd.**

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
**220088, Менск,
вул.Іванаўская, 56**


## TV ПРАГРАМА

# «Бацька» пайшоў у народ

### Але ці захоча народ «бацьку»?

**Вячаслаў Кебіч распачаў актыўную падрыхтоўку да прэзыдэнцкіх выбараў. Як стала вядома карэспандэнту СВАБОДЫ, у структурах ураду прызначаны камісары, адказныя за кожны раён. Як правіла — гэта людзі, якія некалі працавалі ў пэўным раёне, добра ведаюць мясцовыя кадры. Сярод адказных работнікаў апарату Саўміну ёсьць выхадцы амаль з усіх раёнаў, а з тых, адкуль яшчэ няма — цяпер падбіраюцца.**

Кіраваць выбарчай кампаніяй старшыні ўраду будуць самыя блізкія яму людзі.

Афіцыйным кіраўніком перадвыбарчага штабу Кебіча ўжо прызначаны віцэ-прэм'ер Мясьніковіч. Фактычна ж усю справу будзе весьці Г.Данілаў, а ягоным намесьнікам па прапагандзе даручана быць былому старшаму прапагандысту Менскага гаркаму КПБ П.Краўчанку.

Задача нумар адзін: апрача 70-ці дэпутацкіх подпісаў, сабраць за вылучэньне Кебіча кандыдатам у прэзыдэнты яшчэ 150—200 тысячаў подпісаў выбаршчыкаў. Гэтым даручана займацца ўрадаваму сакратарыяту па справах тэрыторыяў, які ўзначальвае таварыш Нікалаеў.

*(Працяг на стар.2)*

Віт-парад хлусьні

# Пэрспэктыўныя палкоўнікі вырываюцца наперад

**Прааналізаваўшы ўсю хлусьню за сакавік, рэдакцыя СВАБОДЫ без ваганьняў прызнала палкоўніка Замяталіна пераможцам нашага штомесячнага Параду хлусьні.**

Калі, як памятаюць нашыя чытачы, ляўрэатам лютаўскага конкурсу стаў Вячаслаў Кебіч, то ў сакавіку эстафэту ад свайго шэфа ўпэўнена перахапіў малады, але вельмі ж таленавіты што да хлусьні прэс-сакратар прэм'ера Ўладзімер Замяталін. Палкоўнік творча перарабіў спадчыну свайго непасрэднага начальніка, навучыўшыся маніць ня проста і суха, як Кебіч, але з фантазіяй і своеасаблівым майстэрствам. «На рахунку» таварыша Замяталіна ня толькі двухразовае абяцаньне грашовых сыстэмаў (спачатку — «у бліжэйшыя дні», потым — «у канцы сакавіка»), але і «адкрыцьцё» прычынаў чарговай няўдачы ў гэтым працэсе. Аказваецца, вінаватыя ва ўсім падкопы «заакіянскіх саветолягаў» і некаторыя расейскія «завлабы», якія ніяк ня могуць пагадзіцца з казуістыкай аб тым, як нявыгадную дамову можна назваць выгаднаю. (Дарэчы, калі б хто-небудзь арганізаваў іншы хіт-парад, то, мяркую, у намінацыі «прэтэнцыйнасьць, якая не адпавядае займанай пасадзе і значнасьці асобы», палкоўнік Замяталін таксама быў бы першым).

Апошнім шэдэўрам «прэс-дзеншчыка» было выкрыцьцё яшчэ аднаго «ворага аб'яднаньня» — Аляксандра Лукашэнкі. Здаецца, у майстэрстве ставіць усё дагары нагамі Замяталіну яшчэ доўга ня будзе роўных. Цалкам магчыма, што палёт фантазіі прэс-сакратара можа прывесьці да таго, што Лукашэнка будзе абвешчаны ізраільскім агентам, Пазьняк — стаўленікам кітайскай кампартыі, а Кебіч — вялікім рэфарматарам.

Тым часам шэф Замяталіна і сёньня не застаўся без узнагароды. Пачэснае другое мейсца ў нашым Парадзе хлусьні Вячаслаў Кебіч заслужыў дзякуючы сваёй бязьмежнай любові да спартсмэнаў. Праводзячы беларускіх алімпійцаў у Лілехамэр, прэм'ер, відаць, быў моцна крануты тым, што прадстаўнік фірмы «Аграінторг» паабяцаў найлепшаму алімпійцу краіны аўтамабіль «Паршэ». У адказ прэм'ер нарадзіў экспромт (зрэшты, уся ягоная дзейнасьць — суцэльны экспромт), таксама паабяцаўшы машыну спартсмэну, які выступіць лепш за астатніх сяброў каманды. Больш таго, ён падбухторыў мэра Менска А.Герасіменку і старшыню Менскага аблвыканкаму А.Цішкевіча паабяцаць тое ж самае (савецкая звычка кругавой парукі).

Пасьля Алімпіяды мінуў амаль месяц. Біятляністка Сьвятлана Парамыгіна ўжо ходзіць на аўтакурсы, бо бізнэсмэны словаў на вецер ня кідаюць. Праўда, і ў іншых спартсмэнаў адбыліся зьмены — у Ігара Жалязоўскага, напрыклад, скралі ягоны стары «Volvo». Пра абяцаны Кебічам прыз ніхто і ня згадвае — экспромт ён і ёсьць экспромт!

І, нарэшце, трэці радок у нашым Віт-парадзе заняла «група таварышаў» з шасьці дэпутатаў Вярхоўнага Савету. Нядаўна ў іх адбыўся некантраляваны выбух пачуцьця гонару й годнасьці. Падчас апошняга абмеркаваньня дакладу Лукашэнкі гэтыя шэсьць сумленных людзей раптам адчулі такую невыносную зьнявагу сваёй асобы ад факту прысутнасьці ў камісіі, што адразу выйшлі зь яе. Глыбока амаральнай падалася ім сама пастаноўка пытаньня аб адстаўцы некаторых членаў ураду. Вядома ж, калі здымалі Шушкевіча, ніякай амаральнасьці ў гэтым не было.

У гэтай «выдатнай шасьцёрцы» я асабліва вылучыў бы Старшыню КДБ Генадзя Лавіцкага, які абурыўся дзейнасьцю «надзвычайных камісіяў, якія паставілі сябе вышэй за закон». Калі з падачы гэтай камісіі здымалі невядома за што ягонага папярэдніка, Лавіцкі быў сумленным сябрам камісіі. Цяпер жа, на новым гістарычным этапе, ён «катэгарычна адмаўляецца» працаваць у ёй. Як слушна заўважыў старшыня Грыб, закрываючы сэсію: «Працу камісіі можна лічыць законченай». А пра карупцыю забудзьцеся.

**Віт**

**На здымку: прэс-сакратар Уладзімер Замяталін.**



## Супраць «рукі Масквы»

**Сёньня, 6 красавіка, а 9-й гадзіне раніцы каля пасольства Расеі ў Менску (вул. Старавіленская, 48) будзе выстаўлены пікет.**

Пра гэта карэспандэнту СВАБОДЫ паведаміў дэпутат Менскага гарсавету Алесь Бяляцкі — адзін зь лідараў Беларускай хрысьціянска-дэмакратычнай злучнасьці, якая выступіла ініцыятарам акцыі пратэсту.

«Мы выступаем супраць эканамічнага й палітычнага шантажу, які Расея ўжывае ў дачыненьні да нашай краіны, — сказаў А.Бяляцкі. — Акрамя таго, мы ня можам моўчкі глядзець, як нахабна паводзяць сябе расейскія спэцслужбы. Мала таго, што яны нашпігавалі сваімі людзьмі ўрадавыя структуры, дык яшчэ і самі адкрыта займаюцца правакацыямі, як гэта было ў лістападзе летась, калі па званку з расейскага пасольства на менскія вуліцы былі выведзеныя ўнутраныя войскі».

**Пятро ПАНКРАТОВІЧ**

## Вярхоўны Савет хоча адгарадзіцца

**У менскі інстытут «Белпраект» паступіла замова зь Вярхоўнага Савету спраектаваць жалезную агароджу вакол будынка ВС.**

Архітэктары, аднак, лічаць, што рабіць гэтага ня варта, бо агароджа вакол былога ЦК КПБ ніяк ня ўпісваецца ў тутэйшае архітэктурнае асяродзьдзе і будзе толькі псаваць выгляд. Чыноўнікі Вярхоўнага Савету ня хочуць слухаць спэцыялістаў і шукаюць архітэктурную кантору, якая возьмецца выканаць замову.

**Мікола ГРЫНЯВІЦКІ**

## Навалімся ўсім калгасам!

**У многіх райцэнтрах Беларусі і нават у калгасах актыўна ствараюцца аддзяленьні Аграрна-дэмакратычнай партыі.**

Ёсьць зьвесткі, што гэтая партыя, якая яднае пераважна калгасна-саўгасную намэнклятуру, зьбіраецца вылучыць на прэзыдэнцкіх выбарах свайго кандыдата.

**П.П.**

## «Если б знали вы, как мне дороги...»

**Зь 1 красавіка ўрад Украіны спыніў рэтрансьляцыю на сваю тэрыторыю перадачаў радыёстанцыяў «Маяк», «Расея-1», «Радыё Масква».**

Гэта выклікана тым, што Расея апошнім часам перастала плаціць за рэтрансьляцыю, і Украіна ўжо панесла выдаткі ў суме 2,3 млрд. расейскіх рублёў. Кіеў заявіў, што рэтрансьляцыя можа быць адноўлена толькі пасьля таго, як Масква сплоціць запазычанасьць.

**І.Ф.**

## Канец галоўнаму аргументу Кебіча

**Расейскі ўрад пад ціскам нафтагазавага комплексу рыхтуецца адмяніць экспартныя пошліны на нафтапрадукты. Выклікана гэта жаданьнем хоць неяк палепшыць фінансавае становішча, калі сусьветныя кошты на нафту падаюць.**

Цяпер Расея экспартуе штогод 120 млн.т. нафты. Скасаваньне пошлінаў зробіць расейскую нафту на сусьветным рынку больш таннай, што дазволіць павялічыць экспарт на 10-15 млн.т. Адмена будзе адбывацца паэтапна. Спачатку, да прыкладу, скасуюць пошліну на вываз газавага кандэнсату. Экспэрты ў Маскве лічаць, што працэс адмены пошлінаў пачнецца самае позьняе зь 1 ліпеня 1994 г.

Як ведама, урад Кебіча апраўдваў сваю лінію на ліквідацыю беларускае грашова-фінансавае сыстэмы праз паглынаньне яе расейскаю тым, што гэта нібыта паспрыяе адмене экспартных пошлінаў на расейскую нафту. Сёньня сытуацыя кардынальна зьмяняецца: Расея здымае экспартныя пошліны для ўсіх. Цікава, чым цяпер Кебіч будзе аргументаваць выгаднасьць для нас грашовага аб'яднаньня з Расеяй?

**Ян ГРЭЧЫЦ**

## Кебіч экспэрымэнтуе на Расеі

**Тымчасам як у Расеі 30.06.94 г. заканчваецца чэкавая прыватызацыя, у Беларусі яе плянуюць распачаць акурат на наступны дзень — 1.07.94 г.**

Напэўна, гэта была хітрая задума ўраду Кебіча — пачакаць, чым скончыцца экспэрымэнт у Расеі. Але ж навукоўцы звычайна выкарыстоўваюць дзеля досьледаў пацукоў, а мы...

**М.П.**


**Падпіска на газэту СВАБОДА прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленьнях**

**Наш падпісны індэкс 63887**


© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

## «Бацька» пайшоў у народ

*(Пачатак на 1-й стар.)*

У райвыканкамы перададзены загад тэрмінова даць сьпісы людзей, гатовых увайсьці ў ініцыятыўную групу збору подпісаў. Рэкамэндавана, каб у іх ліку былі «прадстаўнікі ўсіх пластоў насельніцтва», але найперш каб гэта былі ўплывовыя кіраўнікі прадпрыемстваў, калгасаў і г.д.

Вось што паведамляе наш карэспандэнт з Кобрынскага раёну. Пад патранажам выканкаму тут стварающа аж дзьве групы актывістаў: адна — ініцыятывы, а другая — падтрымкі. Размеркаваныя й абавязкі: першая група будзе зьбіраць подпісы «за вылучэньне кандыдатуры Кебіча», а другая — «падтрымліваць кандыдатуру Кебіча». Даведзены таксама «ліміт» па зборы подпісаў: ня меней за 7 тысячаў. Ці то зь вялікае дурасьці, ці то ў правакацыйных мэтах, але, прыкладам, у вёсцы Хідры ў адну з такіх групаў прапанавалі нават увайсьці намесьніку рэгіянальнай рады ТБМ спадару А.Казловічу. Той, аднак, ад такога «ганаровага даверу» адмовіўся...

Такім чынам, «бацька» пайшоў у народ. Зьнім посьпехаў!

**Мікола ГРЫНЯВІЦКІ**
**Мірон ГАМОН**

# Вячаслава Кебіча не запрашалі ў ЗША

**З адстаўкаю Станіслава Шушкевіча Беларусь страціла адзінага дзяржаўнага дзеяча, якога больш-менш ведалі за мяжою. Цяперашняе беларускае кіраўніцтва надта прагне атрымаць хоць якое-небудзь міжнароднае прызнаньне, што перад выбарамі вельмі патрэбна. Але празьмернае жаданьне заявіць пра сябе як пра палітыка з сусьветным імем часам прыводзіць да канфузаў.**

Беларускія сродкі масавай інфармацыі абляцела навіна, што плянуецца візыт прэм'ер-міністра Вячаслава Кебіча ў ЗША. Урадавае агенцтва «Белінфарм» са спасылкаю на «добра інфармаваныя крыніцы ў Міністэрстве замежных справаў Беларусі» паведаміла, што паездка адбудзецца ў другой палове гэтага году.

Тымчасам амэрыканскі бок, які нібыта прымае госьця, знаходзіцца ў разгубленасьці. Як заявіў мне прэс-аташэ амэрыканскай амбасады ў Менску Конрад У.Тэрнер, «прэм'ер-міністар Рэспублікі Беларусі Вячаслаў Кебіч не атрымліваў афіцыйнага запрашэньня ўраду Злучаных Штатаў Амэрыкі наведаць нашую краіну». Заўважым, што дыпляматычны этыкет не прадугледжвае хаджэньня ў госьці з уласнай ініцыятывы.

Атрыманьне запрашэньня для прэм'ер-міністра папярэдняя датаю і наагул выглядае праблематычна. Шэраг заяваў ягонага прэс-сакратара Уладзімера Замяталіна, характэрных для пары «халоднай вайны», наўрад ці зробяць амэрыканскі ўрад прыхільным да кіраўніка беларускага Саўміну. Абвінавачаньні ў спробе "дэстабілізаваць сытуацыю" ва ўсходнеэўрапейскім рэгіёне і "паслабіць уплыў славянскіх дзяржаваў" яшчэ ніколі не садзейнічалі ўсталяваньню добрых дачыненьняў. Амэрыканцы наўрад ці зробяць скідку на ўсходнеэўрапейскую традыцыю, якая дапускае магчымасьць выкладу прэс-сакратаром уласнай думкі, а ня пункту погляду шэфа.

Ускладняе сытуацыю і той факт, што заява Замяталіна — ня першы выпад беларускіх урадавых чыноўнікаў у адрас ЗША. Год таму на прэс-канфэрэнцыі цяперашні урадавы сакратар Генадзь Данілаў вельмі абразьліва выказаўся пра тагачаснага амэрыканскага пасла ў Менску Дэвіда Сўорца, што адразу ж выклікала жорсткую адваротную рэакцыю па дыпляматычных каналах. Як бачым, урок нічому іх не навучыў.

Не знайшлі разуменьня і памкненьні беларускага прэм'ера пабываць у Нямеччыне. Спробы МЗС арганізаваць у траўні візыт Кебіча ў гэтую краіну не прынесьлі станоўчых вынікаў. На думку нямецкага боку, такая паездка можа адбыцца толькі ўвосень, прычым асноўнаю ўмоваю зьяўляецца прыезд прэзыдэнта Беларусі, а не прэм'ер-міністра.

Натуральна, тыя, хто арганізаваў працёк «навіны» пра візыт Кебіча ў ЗША, выдатна інфармаваныя аб рэальным становішчы справаў. Разьлік, відаць, робіцца на тое, што на прэзыдэнцкіх выбарах такая інфармацыя надасьць прэм'ер-міністру дадатковай вагі. Дарэчы, Вячаслаў Кебіч усё ж мае шанцы наведаць ЗША у другой палове 1994 г. Але толькі як прыватная асоба, якою ён да таго часу, магчыма, і будзе зьяўляцца.

**Аляксандар СТАРЫКЕВІЧ,**
**уласны карэспандэнт газэты «Известия» — спэцыяльна для СВАБОДЫ**



**Кебіч мітусіцца.**

**Віцэ-прэм'ер Мікалай Косьцікаў (на здымку) і астатнія «байцы» ўрадавай каманды не губляюць надзеі.**

# Ваенкаматы мабілізуюць адстаўнікоў у Саюз афіцэраў

**Ёсць зьвесткі, што Міністэрства абароны загадала ваенкаматам заняцца стварэньнем мясцовых структураў Саюзу афіцэраў.**

У бабруйскім Доме афіцэраў заля была поўная. Сабралася каля 600 адстаўнікоў, каб паслухаць, што новага пра пэнсіі, ільготы і г.д. скажа ім начальнік фінансавага аддзелу абласнога ваенкамату А.Гаўрыленка. Але неўзабаве высьветлілася, што сход наладжаны дзеля таго, каб стварыць у Бабруйску гарадзкую арганізацыю Саюзу афіцэраў. Большасьць людзей пакінулі залю. Нават сярод адстаўнікоў цяпер мала знаходзіцца ахвотных «восстановить СССР любой ценой», да чаго заклікае Саюз афіцэраў.

Аднак ваенкамат можа лічыць сваю задачу выкананай. Хаця публіка й разышлася, але арганізацыю стварыць удалося. Старшыня Саюзу афіцэраў генэрал Д.Іваноў быў задаволены і па-брацку ляпаў па плячы ваенкаматаўскага чыноўніка. Генэрал-лейтэнант С.Румянцаў (той самы, які праслявіўся махінацыямі) прымаў віншаваньні — яго абралі старшынёю бабруйскай арганізацыі Саюзу афіцэраў. Нішто сабе кампанія.

**Л.ЗАСЬНЯ**




**На здымку: лідар Саюзу афіцэраў генэрал Іваноў заклікае «восстановить СССР».**

## Лепш позна, чым ніколі?

**Старшыня Гарадзенскай гарадзкой Рады БНФ Кастусь Жынь днямі атрымаў поштаю пастанову адміністрацыйнай камісіі пры Ленінскім раённым выканкаме.**

Ён аштрафаваны на 30 тыс. рублёў за тое, што ў лютым у горадзе распаўсюджваліся ўлёткі, падпісаныя Ўправаю БНФ, у якіх людзей заклікалі падтрымаць агульнацыянальны страйк.

У пастанове камісіі запісана: «На многих вуліцах горада былі вывешаныя аб'явы ў неўстаноўленых мейсцах». 1 красавіка К.Жынь падаў апэляцыю ў суд. Ён хоча апратэставаць рашэньне адміністрацыйнай камісіі.

## Што-што, а піць мы ўмеем

**Слонімскі вінаробчы завод — бадай што адзінае прадпрыемсва ў горадзе, якое працуе стабільна.**

Летась тут у 2,5 разы падвысілі выпуск прадукцыі. Тымчасам на малочным і мясакамбінаце вытворчасьць зьнізілася на трэць.

**Віктар ВАЛАДАШЧУК**

## У доме над Сьвіслачай новы інтэр'ер

**Апошнім часам у менскі дом-музэй I зьезду РСДРП пачала наведвацца багатая публіка.**

Гісторыя бальшавізму абсалютна не цікавіць гэтых багатых людзей. Яны прыяжджаюць сюды на шыкоўных заходніх лімузынах выбраць сабе шыкоўную мэблю. Рэч у тым, што частка музэйных памяшканьняў перададзена ў часовую арэнду пэўнай менскай фірме, якая наладзіла тут выставу нідэрляндзкай мэблі.

Фірма, як сказаў ейны дырэктар Віктар Тужыкаў, займаецца продажам галяндзкай мэблі на беларускім рынку. Тавар выстаўляецца ў доме-музэі таму, што «гэтая ўтульная хатка найбольш падыходзіць для экспазыцыі». Шыкоўныя мэблевыя гарнітуры з дрэва й скуры коштам па 3—4 тыс. даляраў сапраўды эфэктоўна выглядаюць у сыцілым інтэр'еры «зялёнага дому».

Дырэктар музэю сказаў, што такім чынам яны спадзяюцца зарабіць грошы, каб абнавіць музэйную экспазыцыю — «па-новаму паказаць I зьезд РСДРП».

**Вольга МІРКО**

## Ці будзе Карпенка адмываць?..

**У Маладэчне апошнім часам ня дужа шануюць Леніна.**

На помніку правадыру, які стаіць паблізу школы, нехта напісаў фарбаю «КАТ».

*Ул.* **ЧАЦЬВЯРГОЎ**



© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Сёньня

Сяргей ДУБАВЕЦ

# СЫМБАЛЬ МЕРЫ

Сябра ў мяне спытаў, за каго б на выбарах прэзыдэнта Беларусі галасаваў я. Мой адказ яго моцна зьдзівіў, але й нейкіх сур'ёзных пярэчаньняў ён не знайшоў. Ї я падумаў, што мы яшчэ ня раз зьдзівім адзін аднога. Таму што ў нашай грамадзкай думцы яшчэ не напрацаваны стэрэатып прэзыдэнцтва. Ї Беларусь гэтым разам будзе выбіраць усьляпую, слаба цямячы — каго, чаго й навошта. Барацьба ідзе паміж тактыкамі й асобамі, за якімі няма вечнасьці. Між тым, задаючы пытаньне «якім вы ўяўляеце сабе беларускага прэзыдэнта?» мы міжволі задаем пытаньне — якой вы ўяўляеце сабе Беларусь?

Беларусь — сярэдняя краіна, сярэдняя нацыя, не вялікая й не маленькая. Такіх шмат. Ї Прэзыдэнт Беларусі — гэта Сымбаль Меры. На маю думку, з шэрагу прэзыдэнтаў БНР найлепш адпавядаў гэтай пасадзе Мікола Абрамчык.

Разам з тым у самой пасадзе прэзыдэнта мусіць быць нешта вышняе. Гэта значыць, што выбары выбарамі, а рэальна існуе толькі адзін чалавек на гэтую найвышэйшую пасаду.

Сёньняшні сьпіс кандыдатаў — гэта ўзбэцкі ці туркменскі, у лепшым выпадку расейскі варыянт. Азіяцкі ці эўразійскі. Але Беларусь эўрапейская краіна, і таму я думаю пра варыянт Чэхіі, пра Сьветлага Чалавека. Ї гэта мая першая ўмова.

Сьветлы Чалавек будзе імкнуцца панаваць у Сьветлай Краіне. А для гэтага ён мусіць бачыць яе такой, як у Канчэўскага, Абрамчыка, Караткевіча — сьветлай, фантастычнай, дзівоснай. Такой ён мусіць яе ведаць, любіць і будаваць.

Гэта другое істотнае пытаньне — якой кандыдат бачыць Беларусь? Якой ён яе ведае? Сёньняшнія кандыдаты не арыентуюцца ў беларускай гісторыі, культуры, літаратуры, духоўнасьці, мэнталітэце нацыі. Яны ўсё яшчэ працуюць у стылі палітыкаў-дылетантаў, маўляў, мы ўсё гэта толькі пачынаем, самі вучымся. Дзіўнае апраўданьне для прэзыдэнта...

Паводле духу ён мусіць быць дзеячом не XIX стагодзьдзя, ці 20-х, ці 50-х гадоў, але сёньняшнім. Мне хочацца, каб ён быў нацыяналістам, але гэта, урэшце, ня так істотна. Важна, каб ён быў сёньняшнім дзеячом. Каб стаяў на трох традыцыйных для Беларусі культах — сям'я, творчасьць, Радзіма. Таму ён мусіць прынамсі ўмець размаўляць зь дзецьмі.

Ён мусіць быць валявым чалавекам, але ў тутэйшым мэнтальным разуменьні Волі. Беларускі мужчына — кемлівы, нягрэблівы да працы і не чужы да вайсковае справы.

Добра, калі ён будзе не зьвязаны, не зашмулены ў цяперашняй палітыцы і зарыентаваны не на якуюсь з гэтых ідэялёгіяў, а на ўсю масу народу — нармальных людзей. Дзяржаўную ідэялёгію трэба будзе ствараць яму. Сёньняшнія сурагаты не падыйдуць. Ён ня мусіць апэляваць да якой-кольвек групавой «сознательности», а толькі да выгады людзей. Галасаваць за яго павінна быць выгадна. Ї ўсё, ніякіх іншых матываў.

Нарэшце, ён мусіць мець ладнае аблічча, каб на яго хацелася глядзець, і нармальныя жаданьні — каб яго хацелася слухаць. Я думаю, што сярод іншых кандыдатаў ён мусіць выглядаць апалітычна. Але толькі сярод гэтых іншых кандыдатаў.

Ён ня мусіць клікаць ані ва ўчора, ані ў заўтра, ані ўправа, ані ўлева. Ён мусіць сёньня і тут рабіць беларускі парадак у Беларускім Доме.

А сябра я зьдзівіў, калі сказаў, што галасаваў бы за Адама Глёбуса — за Валодзю Адамчыка. Чаму? Таму што ён нармальны і таму што для мяне, маёй сям'і, маіх сяброў, майго занятку такі прэзыдэнт — выгадны.

# Прэзыдэнт павінен сказаць...

Накід праграмы

Трэба навесьці парадак у дзяржаве Беларусь!

Адмаўленьне савецкага ладу перарасло ў непрыняцьце любой формы арганізацыі жыцьця, і ў нашай краіне запанаваў прывід свабоды безь мяжы. Але дзяржава ня можа існаваць бяз формы, без дакладна акрэсьленых абрысаў. Гармонія ў пабудове моцнай краіны — гэта сыстэма. Трэба сказаць: тут — сьвятое, а гэта — чужынскае, там — варожае, а тут — сваё! Сыстэма павінна адпавядаць нашай зямлі, нашаму народу і нашым спрадвечным традыцыям.

Парадак — гэта ня толькі завядзёнка, звычай, але і няспынны працэс падтрыманьня сыстэмы каштоўнасьцяў.

Раней была формула: мы жывём пры сацыялізьме ў краіне СССР і разам будуем нейкі там камунізм.

А цяпер?

Трэба наводзіць парадак у жыцьці, у доме, у краіне.

Хто з Божае ласкі, а хто воляю лёсу — усе мы апынуліся ў новай дзяржаве і мусім жыць па-новаму. Розум, развага, мужнасьць і патрыятызм павінны спыніць скочваньне да дзікунства, калі ўсе ўадначасьсе загавораць, але ніхто нікога не пачуе, калі людзі прыйдуць на пляц Незалежнасьці і, забыўшыся на свой дом, сваю працу, сваю дзяржаву, пачнуць разьдзіраць іншых людзей на кавалкі, вось тады заўладарыць хам.

Народ Беларусі варты іншага гаспадара. Таму новы парадак будзе і жаданы, і любімы, і няўмольны, бо ён доўгачаканы й непазьбежны.

Досыць разбурэньня, досыць крадзяжу, хопіць гарлапанства й падману.

Ёсьць дзяржава, ёсьць народ, і засталося няшмат, засталося навесьці дысцыпліну.

Любая дэмакратыя ўзвышаецца на трывалым падмурку законнасьці, дамоўленасьці й дзяржаўнага інтарэсу.

Беларускі нацыяналізм адыграў сваю асноўную ролю — паспрыяў стварэньню дзяржавы.

Цяпер прыярытэтнае месца зойме дзяржаўны інтарэс Беларусі.

Калі нехта выступіць супраць арганізаванасьці, ён выступіць за бязладзьдзе, за гвалт, за вайну, і гэты нехта мусіць выбраць сабе іншы дом у іншай краіне.

За антыбеларускую дзейнасьць вінаваты атрымае жорсткае пакараньне.

Слова БЕЛАРУСЬ зьвязвалі са словамі: культура, мова, народ... А сёньня мы зьвязваем БЕЛАРУСЬ са словамі: дзяржава і парадак.

Гаворачы пра Беларусь, адны займаліся мастацтвам, другія навукай, трэція сям'ёю, чацьвертыя рэлігіяй, бо гэта ўсё было ясьнейшае, чым дзяржаўнасьць. Адны сябравалі з Варшавай, другія з Масквой, трэція з Бэрлінам, а чацьвертыя з Тэль-Авівам — бо гэта зноў жа было ясьнейшае. Але ёсьць і новы шлях для Беларусі — будаваць незалежную краіну. Нельга чакаць лепшых часоў, калі не прыбіраць бруд і сьмецьце. А прыбрацца лягчэй у адной кватэры, чымсьці ў многіх; у адным доме, чым у мікрараёне; у адной Беларусі, чым у неакрэсьленай Садружнасьці незалежных дзяржаваў.

Лад жыцьця ў Польшчы не такі, як у Чэхіі, а там не такі, як у Расеі ці на Ўкраіне; тое і зь Беларусяй, яна іншая ад усіх. Гэта вынікае з нацыянальнай прыроды, гэта й розьніць краіны, бо з гэтага вымалёўваўся іхны вобраз, абрыс, мяжа.

Беларусь павінна акрэсьліцца з усіх бакоў.

Вобраз дзяржавы ствараюць і ейныя палітыкі, парлямантары. Сёньня яны працуюць паводле прынцыпу «абы ціха, абы добра», пры гэтым кожны бачыць свой шлях да спакою і дабра. А ў выніку атрымліваецца бязладзьдзе. Такі парлямант варта распусьціць. У новы парлямант трэба абраць мужных, дзейных, сумленных людзей, якія ўсталююць у дзяржаве спакой і правы чалавека.

Калі не абяром сваіх, будуць панаваць чужынцы. Тое ж і з прэзыдэнтам. Калі не абраць валявую асобу, здатную стаць дзяржаўным мужам, на беларускі трон ускараскаецца недавярак, згодны прадаць усё чыста за трыццаць срэбранікаў. Такога дапусьціць нельга.

Нідзе і ніколі дзяржава не набывала станоўчых якасьцяў без панаваньня права большасьці, без прыярытэту нацыянальных інтарэсаў і, галоўнае, безь дзяржаўнай ідэялёгіі. Для народу Беларусі іншага шляху няма.

Перш за ўсё трэба:

стварыць магутнае прафэсійнае войска і ўмацаваць міліцыю;

трэба адчыніць беларускія межы для ўсіх сумленных людзей і зачыніць для бандытаў;

трэба ўвесьці залаты дукат, які спыніць інфляцыю;

трэба забясьпечыць грамадзянам Беларусі чалавечую старасьць і нармальнае дзяцінства;

трэба раздаць грамадзянам Беларусі зямлю і дазволіць яе продаж;

неабходна прадаць і здаць у арэнду большую частку заводаў і фабрыкаў;

тым, хто не пажадае браць зямлю ды іншую маёмасьць, трэба выплаціць адпаведны кошт золатам.

У наш час на беларускай зямлі аб'ектыўна ня можа быць вызначана задача — будаваць чысты капіталізм або ідэальны сацыялізм. І гэта добра: досыць лепшай будучыні для нікога.

Усё, што нам трэба — гэта навесьці парадак у дзяржаве Беларусь!

**Адам ГЛЁБУС**

Зянон Пазьняк:

# «Расейская „пятая калёна” на Беларусі — гэта рэальная зьява»

**Падчас абмеркаваньня «Народнай газеты» на апошняй сэсіі Вярхоўнага Савету лідар Апазыцыі БНФ падсумаваў вынікі дыскусіі вакол ягонага артыкула «О русском империализме и его опасности». Друкуем фрагмэнты стэнаграмы выступу З.Пазьняка.**

...Гістэрычная, ненатуральная і нават неадэкватная рэакцыя на мой артыкул «О русском империализме и его опасности», падрыхтаваны для саўмінаўскай «Советской Белоруссии» і надрукаваны ў «Народнай газэце», — тлумачыцца псыхалягічным вынікам раптоўнага зьдзіраньня маскі з фальшывай позы, за якой маскаваліся расейскія дзяржаўныя імпэрыялісты ўсіх масьцяў і іхная пятая калёна ў Беларусі. Да гонару расейскай думкі, там хоць слабенькая крытыка гэтай шавіністычнай эпідэміі, але ўсё ж пачынае гучаць. Сп-ня В.Васільева, напрыклад, піша ў №6 расейскага дэмакратычнага часопіса «Новое время»: *«На заседании президиума Совета Министров Андрей Козырев предложил оказать финансовую помощь русским общинам в ближнем зарубежье, с тем чтобы их представители со временем смогли занять командные посты в экономике бывших союзных республик».*

Такім чынам, расейская «пятая калёна» ў краінах СНД — гэта не абстракцыя, не мэтафара, не эўфэмізм, а канкрэтная палітыка і рэальная зьява. Дарэчы, на Беларусі заняцьце камандавых пасадаў у эканоміцы клеўрэтамі чужой краіны адбываецца інтэнсіўна і даўно пры дапамозе адпаведных структураў Саўміну і расейскай рэзыдэнтуры, што дзейнічае тут нахабна і амаль адкрыта.

Далей сп-ня Васільева піша: *«Министр Козырев, недавно начавший осваивать поприще «патриота», высказался гораздо более радикально, чем господин Жириновский, уже получивший ярлык «фашиста».*

Дактрына Козырава-Жырыноўскага ды іншых спадароў зь цяперашняга расейскага кіраўніцтва, гэтак жа як і дактрына Гітлера, грунтуецца на этнічным шавінізьме, на сьцьверджаньні «жыцьцёвых інтарэсаў» Расеі ў дзяржавах Балтыі і СНД і на абароне правоў «русскоязычных» у гэтых краінах. Гэта ёсьць клясычная імпэрская праява фашызму. З фашызмам трэба змагацца.

Сындром жырыноўшчыны, імпэрскага шавінізму захліствае расейскае палітычнае кіраўніцтва. Галасоў здаровага сэнсу амаль не чуваць. У Расеі няма дэмакратычнай апазыцыі. Апазыцыя там чырвона-карычневая. А гэта значыць, што Расея ня мае дэмакратычнай пэрспэктывы. У лепшым выпадку там гарантаваная дыктатура ці таталітарны рэжым; у горшым — грамадзянская вайна. На гэтай выснове сыходзяцца дасьледнікі цяперашняй Расеі.

Руская інтэлігенцыя, рускае грамадзтва ганебна маўчыць. Сумленьне Расеі стала бараніць, як ні дзіўна, пакуль адна сп-ня Валерыя Навадворская. *«Когда президент России,* — піша яна ў «Известиях» (4.03.1994), — *обращается к президенту Латвии с заявлением о том, что бесправие там русскоязычных очень трогает и беспокоит не только его, но и весь наш народ, слушать это стыдно... Потому что это ложь насчет нарушения прав. Нормальным людям там давно дали права... Что же произошло с Андреем Козыревым, Сергеем Шахраем, Владимиром Шумейко?* (Ці, дадам ад сябе, з Міхаілам Палтаранінам, што адкрыў «лягерны іўрыт». — **З.П.**). *Да то же, что с персонажами пьесы Ионеско «Носороги»... Страх потерять жизнь и власть движет теми, кто переходит на сторону носорогов... Мы сделаем то, что не смогли сделать из позиции врага, потрясая ядерной дубиной: уничтожим Запад изнутри, навязав ему то, что пока является единственным продуктом нашего экспорта, то есть свое хамство, свой беспредел, свое невежество, свое перманентное насилие... Что мы еще умеем, кроме того, чтобы рвать на части заживо, как Грузию, как Молдову, как Таджикистан?»* Так пішуць рускія людзі, якім баліць душа за Расею.

...Нармальныя людзі, шаноўныя спадары, дзе б яны ні жылі — ў Расеі ці ў Беларусі — ня будуць падтрымліваць імпэрскую палітыку, фашысцкія і камуністычныя пагрозы (...) і антырускія настроі тут ні пры чым. Добра, каб гэта зразумелі і ў гэтай залі. Тыя, вядома, хто здольны нешта разумець.

17 сакавіка 1994 г.





© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Партыя расейскамоўных палякаў

Як чалавек, неабыякавы да «польскай справы», я прыйшоў на ўстаноўчую канфэрэнцыю, дзе ствaралася рэгіянальная арганізацыя Польскага дэмакратычнага згуртаваньня (ПДЗ). Перад уваходам у залю кожны ахвотны мог узяць аркуш з уступнай заявай, дзе па-беларуску было запісана «Лічу сваім грамадзкім абавязкам унесьці ўклад у дэмакратычнае адраджэньне культурнай спадчыны польскага і іншых народаў Рэспублікі Беларусі». Апроч гарадзенцаў, прысутнічалі прадстаўнікі Ліды, Ваўкавыска й Воранава.

Горадня, як вядома, — цэнтар польскага руху. За сталом на сцэне, аднак, былі незнаёмыя людзі, а кіраўнікі Саюзу палякаў Беларусі сядзелі ў залі. У іх я заўважыў пэўную насьцярожанасьць, прынамсі скептыцызм. Нават мне перадалася іхная ніякаватасьць. Вось жа, прыехалі нейкія сталічнікі агітаваць у сваю партыю, па-польску ня надта гавораць, і прозьвішчы зусім ня польскія — Ахрэм (старшыня) і Працкайла (намесьнік). Вёў сход дырэктар гарадзенскага камбінату будаўнічых матар'ялаў сп. Закрэўскі.

Спадар Працкайла зачытаў па-беларуску Статут, як бы сабе ў апраўданьне зацеміўшы, што недзе існуе і ягоны польскамоўны варыянт. Са Статуту вынікала, што іхная партыя парляманцкага тыпу, выступае за тэрытарыяльную цэласнасьць Беларусі, за дэмакратычныя рэформы і г.д. Бліжэйшая палітычная задача — уступіць у блёк зь іншымі дэмакратычнымі партыямі, вылучыць кандыдатаў у дэпутаты ўсіх узроўняў, а таксама вызначыцца з кандыдатурай на прэзыдэнцкіх выбарах.

Старшыня партыі сп. Ахрэм сказаў, што яны будуць бараніць гэтую зямлю самі, гуртам. Маўляў, бацькі некалі чакалі з Англіі генэрала Андэрса, але не дачакаліся. Таму трэба спадзявацца толькі на самых сябе. Пры рэгістрацыі іх змушалі выкасаваць з назову партыі слова «польскае», абвінавачваючы ў нацыяналізьме. Але сп. Ахрэм адхіліў закіды. Людзі ў нас, маўляў, перамяшаліся, і ніхто назад падзелу рабіць ня будзе: у сем'ях нярэдка мужык паляк, а жонка беларуска, ці наадварот. У партыю таксама запісваюцца габрэі, рускія, беларусы, татары. Нарэшце, Польскае дэмакратычнае згуртаваньне асьвячана ў царкве ў Менску і ў Салоцкінскім касьцёле... Потым старшыня ПДЗ прамовіў амаль на гадзіну спавешчаньне, дзе тлумачыў эканамічную канцэпцыю партыі.

Далей пачаліся выступы паводле сьпісу. «На государственном (?!) — русском языке» пажадаў выступіць сп. Казакевіч. Ягоны прыклад прыйшоўся даспадобы ўсім наступным, яны заклікалі «создать комитеты партии в каждом районе, на каждом крупном предприятии». Я вушам сваім не даваў веры: зьбянтэжана перапрашаючы за няведаньне польскае мовы, выступоўцы з палёгкай пачыналі прамаўляць на «великом и могучем»! Вось табе й маеш польскую партыю.

Нездарма ж сьледам за імі ад Саюзу палякаў выступіў сп. Кацынэль, які пачаў з папроку: вы хаця б праз аднаго выступалі па-польску... Ён адразу зрабіў афіцыйную заяву. Управа Саюзу палякаў вырашыла, што ня будзе ўдзельнічаць у кіраўнічых органах абласной арганізацыі ПДЗ, але згаджаецца супрацоўнічаць. Сп. Кацынэль таксама выказаў няверу ў тое, што палякі здолеюць змагацца ў палітычнай барацьбе самі. Ён спаслаўся пры гэтым на досьвед Беларускага дэмакратычнага аб'яднаньня ў Польшчы, якое ня мела посьпеху на парляманцкіх выбарах. Сп. Кацынэль лічыць, што сёньня ўсім трэба думаць, як пасунуць наперад беларускую справу і змагацца за сувэрэнную беларускую дзяржаву, якая мае апошні гістарычны шанц быць пабудаванай. А ў сапраўды дэмакратычнай краіне павінна быць добра ўсім — беларусам, палякам, расейцам ды іншым.

У канцы сп. Ахрэму задавалі пытаньні, часам нязручныя. Ён сказаў, што камуністам быў не зь перакананьня. Хадзіў у касьцёл, хрысьціў дзіця, за што атрымаў партыйныя спагнаньні. Пачынаў ён дырэктарам базы ў сваім родным Салоцкіне (мястэчка каля польскай мяжы ў Гарадзенскім раёне), потым працаваў дырэктарам саўгасу, начальнікам управы ў Дзяржаграпраме. Сёньня старшыня ПДЗ — прэзыдэнт закрытага таварыства «Белтрубаімпарт» з удзелам Расеі, Нямеччыны й японскай «Міцубісі», адначасова ўзначальвае фірму «Эгні». Яны заснавалі й фінансуюць у Менску Беларускі камэрцыйны ўнівэрсытэт, а ў ягоным складзе — Польскі інстытут кіраваньня й вонкавай эканамічнай дзейнасьці.

Апроч сталіцы, створаны раённыя арганізацыі польскага Згуртаваньня ў Клецку, Барысаве і самая моцная — ў Нясьвіжы. Цяпер вось абласная — у Горадні, а 7 красавіка будзе ствярацца ў Берасьці. Першым абласным горадам, праўда, быў Віцебск, аднак там людзі пабойваюцца ўступаць у ПДЗ... На гарадзенскай канфэрэнцыі сп. Ахрэма спыталі, ці ягоная партыя аб'ядноўвае «рускіх палякаў»? Ён адказаў, што ня ведае такой нацыі. Аднак усе расейскамоўныя прамоўцы аказаліся абласнымі начальнікамі рознага рангу, пераважна ў будаўніцтве й сельскай гаспадарцы, і ўсіх іх улучылі ў 9-асабовую Раду. Прычым ніхто зь іх не адмовіўся.

Відавочна, стаўка робіцца на прамысловую, гаспадарчую эліту. Яна была адарваная ад непасрэдна ідэялягічнага жыцьця КПСС і ня мае патрэбы далучацца да сёньняшняга пракамуністычнага руху. Тым больш яна ня пойдзе ў партыі, якія маюць у назве слова «беларуская». Аднак гэтыя людзі ўяўляюць зь сябе пэўную сілу, якая жадае ўплываць на палітычныя працэсы. Мне здаецца немалаважным, што яны таксама ня хочуць уступаць і ў прамаскоўскія лібэральна-дэмакратычныя партыі. Вочы гэтых людзей глядзяць у адваротны, часьцей польскі бок.

Пасьля ўстаноўчай канфэрэнцыі мне давялося пагутарыць з блізкім да кіраўніцтва Саюзу палякаў чалавекам. Ён іранічна і нават непрыязна выказаўся пра арганізатараў Згуртаваньня. Нідзе ў Эўропе, за ягонымі словамі, палітычныя партыі нацыянальных меншасьцяў не пашырыліся. Вось Саюз палякаў, на ягоную думку, — сіла, якая рушыць польскае адраджэньне, а ПДЗ створана, каб задаволіць амбіцыі розных начальнічкаў, якія ў большасьці нават паленаваліся або зусім не палічылі патрэбным напачатку хаця б вывучыць польскую мову.

**Сяргей АСТРАЎЦОЎ**

# Арцыбіскуп Казімеж Сьвёнтак сумняваецца ў вартасьцях беларускае мовы

У інтэрвію польскаму часопісу *Kultura*, які выходзіць у Парыжы (№3, 1994 г.), арцыбіскуп Менскі й Магілёўскі Казімеж Сьвёнтак скардзіцца, што *«ёсьць праваслаўныя, якім перашкаджае, што мы карыстаемся польскаю мовою»*. Таксама ён жаліцца, што *«ня маем літургічных кніг у беларускай мове, і акрамя таго, значная большасьць нашых вернікаў польскага паходжаньня»*.

Ксёндз-біскуп адзначае, што *«асноўная цяжкасьць палягае таксама на тым, што ў беларускай мове бракуе адпаведнай літургічнай і тэалягічнай тэрміналёгіі»*.

Апрача ўсяго, зазначае біскуп у інтэрвію, *«беларуская мова яшчэ не ўнармаваная, ёсьць шэраг лякальных дыялектаў у залежнасьці ад рэгіёну»*. Біскуп таксама дзівіцца, *«як можна дамагацца ўжываньня беларускай мовы ў касьцёлах, калі гэтая мова не знаходзіцца ў абыходку грамадзкага жыцьця»*.

Пад канец ксёндз-біскуп палічыў патрэбным сказаць: *«Трэба адзначыць, што ўрад Беларускай Рэспублікі падпісаў міжнародную канвэнцыю аб ахове этнічных і рэлігійных меншасьцяў. Праваслаўныя неаднойчы ігнаруюць гэты факт. Польскія каталікі маюць права карыстацца роднаю моваю»*.

Хацелася б задаць шаноўнаму біскупу — ганароваму сябру Саюзу палякаў Беларусі — некалькі пытаньняў:

1. Ці толькі праваслаўныя на Беларусі ўздымаюць пытаньне беларускай мовы ў касьцёле?

2. Хто замінае яму весьці працу над падрыхтоўкаю й выданьнем літургічных кніг па-беларуску, ці можа гэта павінен рабіць у Беларусі хтосьці іншы, апрача касьцёлу?

3. Ці зроблена біскупіяй хоць што-небудзь для сабраньня, уліку й выданьня тае найбагацейшае беларускае каталіцкае тэрміналёгіі, якую распрацавалі і плённа ўжывалі беларускія ксяндзы перад вайною і пасьля на эміграцыі? Нагадаем, што беларуская каталіцкая літаратура налічвае сотні й сотні пазыцыяў.

4. Ці можна меркаваць пра ўнармаванасьць, да прыкладу, польскае мовы, паслухаўшы гураля і сьлянзака? Ці для літаратурнае мовы існуюць усё ж такі іншыя крытэры?

5. Ці адрозьнівае біскуп «касьцельных» палякаў ад палякаў этнічных?

Біскуп Сьвёнтак хоча пераканаць чытачоў *Kultury*, што каталік у Беларусі — гэта паляк.

Цікавым чынам польская каталіцкая ерархія ў Беларусі праводзіць ідэі каталіцкага ўнівэрсалізму.

**Антоні ДАМБРОЎСКІ**




*Малюнак Лявона РАЗЛАДАВА*

# Літ будзе прывязаны да даляра

**31 сакавіка ўрад Летувы прыняў рашэньне датасаваць сваю нацыянальную грашовую адзінку літ да амэрыканскага даляра. Курс вызначаны як 4 Lt за $1.**

Гэта значыць, што курс літа да іншых валютаў сьвету будзе вагацца адпаведна ваганьням даляра. На гэты крок летувісы здолелі пайсьці, лібэралізаваўшы банкавае заканадаўства й стварыўшы ня ў самы спрыяльны для эканомікі час валютны запас у 340 млн. USD. Тым ня менш, рашэньне прымалася не бяз спрэчак у вышэйшым кіраўніцтве.

Сваю валюту яшчэ ў 1992 г. да нямецкае маркі датасавалі эстонцы (паводле курсу 1DM=8EEK). Але там гэта было аформлена міждзяржаўным пагадненьнем. Практыка прывязак сваіх валют да амэрыканскага даляра, ангельскага фунта, нямецкай маркі ці францускага франка прынятая блізу ў 70-ці краінах. Між тым прынцыпы гэтых прывязак кардынальна адрозьніваюцца ад прапановаў ураду Кебіча, які намагаецца цалкам зьліквідаваць самастойную фінансавую сыстэму Беларусі, а значыць і сувэрэнітэт краіны. Усё, па задуме Кебіча, павінна скончыцца вельмі вульгарна: папросту на Беларусь прыходзіць вельмі нестабільная валюта — расейскі рубель.

Дзяржавы ж, якія абвяшчаюць аб датасаваньні курсаў, захоўваюць падначаленую сабе грашова-фінансавую сыстэму, але праз арыентацыю на значна больш распаўсюджаную валюту дамагаюцца пэўнага ўзроўню канвэртацыі. Затое адначасова й аўтаматычна гэтыя дзяржавы бяруць на сябе абавязкі весьці строгую інфляцыйную ды бюджэтную палітыку.

**Ян ГРЭЧЫЦ**

# «Polonia» на Ўсходзе: спроба нестандартнага погляду

**Вядомы польскі месячнік *Więź* нядаўна апублікаваў грунтоўны матар'ял, прысьвечаны палякам на абшарах былога СССР. Нам падалося, што аўтар артыкула Богдан Скарадзіньскі паспрабаваў больш-менш аб'ектыўна ацаніць становішча палякаў на Ўсходзе.**

Напачатку аўтар зазначае, што, насуперак легендзе, усходнія палякі — гэта зусім не нашчадкі ваяроў і ссыльных, а людзкія рэлікты польскай дзяржаўнасьці, якая апошнім часам адсоўвалася ўсё далей і далей на Захад. Далей Богдан Скарадзіньскі піша, што гэтая частка польскага народу няўпынна памяншаецца; паводле афіцыйнай статыстыкі, з 1380 тыс. асобаў у 1959 г. яна скарацілася да 1126 тыс. праз трыццаць гадоў.

На пытаньне «Ці можна верыць у дакладнасьць лічбы 1126 тыс. суродзічаў?» аўтар артыкула без ваганьняў адказвае: «Не, гэта колькасьць умоўная». Ён адзначае, што лічбы ўзятыя з афіцыйных перапісаў, якім не заўсёды можна давяраць. Наагул, якое можа быць абгрунтаваньне для нацыянальных пачуцьцяў, асабліва ў атачэньні іншых народаў? «Вядома, не этнічнае паходжаньне, бо на працягу XX стагодзьдзя тут адбывалася перамешваньне людзей і цэлых пакаленьняў...» — піша Богдан Скарадзіньскі. Ён мяркуе, што пяць, а можа нават і дзесяць мільёнаў «савецкіх» грамадзянаў ня мелі б цяжкасьцяў у пошуку якіх-небудзь польскіх продкаў. Тады, можа, магло б стаць крытэрам веданьне мовы? Не, уважае аўтар, бо ледзьве адна трэць з тых, што лічаць сябе палякамі, прызнае польскую мову за родную. Пры такім крытэры колькасьць палякаў на Ўсходзе не перавышала б 400 тыс. чалавек.

У такім разе, мяркуе аўтар артыкула, большае значэньне трэба надаваць не «фармальнай», а «функцыйнай» польскасьці, г.зн. неяк выяўленай у штодзённым жыцьці. Праявы гэтыя могуць быць самыя розныя. Ёсьць сярод усходніх палякаў фанатыкі-шавіністы, якіх цяжка знайсьці ў самой Польшчы, але ёсьць і такія, што аддаюць польскім справам некалькі гадзінаў у тыдзень, а то і ў месяц.

«Амаль палова нашых суайчыньнікаў, — адзначае далей Богдан Скарадзіньскі, — а калі больш дакладна, 550 тыс. у 1989 г., сканцэнтраваная на беларускай Гарадзеншчыне і ў ваколіцах Вільні, утвараючы свайго роду блёк. Гэта палягчае самаарганізацыю й судзеяньне, калі ўдаецца ня ўцягвацца ў палітычныя канфлікты, якіх не пазбаўленыя дачыненьні паміж Летувой ды Беларусьсю. Вялікае значэньне мае лёгкасьць доступу да Польшчы і з Польшчы; гэтая блізкасьць набудзе яшчэ большае значэньне ў будучыні, калі людзі пачнуць забывацца, што гэтыя землі некалі ўваходзілі ў склад Польшчы, і нашае новае суседзтва зь Летувой і Беларусьсю здасьць на практыцы свае іспыты».

**Падрыхтаваў Віктар ЛУК'ЯНАЎ**



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Шпіёнская адысэя Эймза

**Хоць прайшло ўжо больш за месяц з часу арышту расейскага шпіёна Ольдрыча Эймза, Амэрыка ніяк ня можа ачуняць ад шоку. Чаму ён бесьперашкодна дзейнічаў аж 9 гадоў? Чаму ніхто не зьвярнуў увагі на ягонае раптоўнае ўзбагачэньне? Чаму шмат гадоў нікога не турбавала, што не ўдавалася ніводная паважная выведная апэрацыя супраць СССР і што правальваліся ўсе асноўныя агенты ў гэтай краіне?**
**Кангрэсмэны прагнуць крыві. Але цяжка пакараць Джэймса Вульсі, які стаўся дырэктарам ЦРУ год таму, г.зн., калі Эймз ужо быў пад наглядам. Магчыма, што ахвярай Эймза станецца сама ЦРУ, калі раззлаваны кангрэс абсячэ 28-мільярдавы бюджэт гэтай арганізацыі. Вульсі засьцерагае, што гэта было б памылкаю, бо рэальныя выдаткі на выведныя мэты ўжо і так упалі з 1990 г. на 14%.**

### Спадчына Энгльтана

Друк тымчасам далей высьвятляе, чаму Эймза не схапілі раней, каго ён выдаў, якую інфармацыю перадаў, ці ён уцягнуў у шпіёнства сваю жонку, ці, можа, яна яго. У дзень арышту Марыя дэль Разарыё Казас Эймз некалькі гадзінаў размаўляла з агентамі ФБР (Ольдрыч Эймз маўчаў і адразу ж запатрабаваў адваката) і, здавалася, была гатовая супрацоўнічаць са сьледчымі. Потым, аднак, яна таксама перастала гаварыць. Ніхто зь іх не прызнаў сваёй віны, а абарона, напэўна, будзе дамагацца на працэсе раскрыцьця таемных дакумантаў. Гэта пастравіць ЦРУ ў цяжкую сытуацыю. Калі Эймзы не пачнуць гаварыць, дык ніколі ня будзе вядома, якую інфармацыю яны перадалі Маскве.

На думку аднаго з афіцэраў ЦРУ, контрвыведка апынулася на апошнім мейсцы ў сьпісе прыярытэтаў агенцтва. Відавочна, гэта сталася вынікам 20-гадовай дзейнасьці легендарнага «хапальніка шпіёнаў», шэфа нутраной контрвыведкі ЦРУ, Джэймза Энгльтана, якога змусілі пайсьці на пэнсію ў 1975 г. Перад гэтым ягоная апантанасьць пошукам чужых агентаў у ЦРУ зламала многія кар'еры і практычна паралізавала дзейнасьць агенцтва супраць СССР. Энгльтан ніводнага «крата» не знайшоў, бо, хутчэй за ўсё, у ЦРУ яго тады й не было. Зьявіўся ён толькі праз дзесяць гадоў пасьля сыходу Энгльтана. Паколькі гэты апошні нарабіў болей шкоды, чым калі б сам быў расейскім шпіёнам, благі досьвед прымушаў адроджаную ЦРУ ставіцца да нутраной контрвыведкі зь вялікай засьцярогай.

Першыя падазрэньні, што ў агенцтве ёсьць «крот», узьніклі, калі ў 1986 г. у Маскву былі адкліканыя два супрацоўнікі савецкай амбасады ў Вашынгтоне — агенты КДБ, завэрбаваныя некалькі гадоў перад тым ФБР. Валеры Мартынаў і Сяргей Маторын былі расстраляныя за здраду дзяржаве. Тады ж перасталі ўдавацца іншыя выведныя апэрацыі супраць СССР. Аднак гэта прыпісалі дзейнасьці Эдварда Лі Ховарда, агента ЦРУ, які ўцёк у 1985 г. у Маскву, а таксама Клейтана Лёўнтры, вартаўніка амэрыканскай амбасады ў Маскве, асуджанага за шпіянаж.

Робэрт Гейтс, тагачасны дырэктар ЦРУ, прыйшоў да перакананьня, што ў агенцтве мусіць быць нейкі іншы шпіён, які папярэдзіў Ховарда, бо перад уцёкамі той быў пад пільным наглядам. У сьпісе падазраваных тады ўпершыню зьявілася прозьвішча Эймза, але дасьледаваньне пасоўвалася надта павольна. Калі ў 1989 г. ЦРУ страціла трох найкаштоўнейшых падвойных агентаў, якіх потым расстралялі ў Маскве, працу паскорылі, і сьпіс падазроных звузіўся да 200 афіцэраў.

Тымчасам Ольдрыч Эймз, зарабляючы няпоўныя 70 тысячаў даляраў у год, купіў сабе за 540 тысячаў вілу пад Вашынгтонам, у якой правёдзіў каштоўны рамонт. Адзін з супрацоўнікаў агенцтва нават зьвярнуў увагу начальства на тое, што Эймз жыве не паводле сродкаў, але толькі праз два гады таго запыталі, дзе ён узяў гэтульки грошай. Спраўджваньне ягонага адказу — што жонка атрымала вялікую спадчыну ў Калюмбіі — заняло яшчэ год.

Сьледзтва значна паскорылася, калі ў 1991 г. была ўтвораная аб'яднаная сьледчая група ФБР і ЦРУ. Сьпіс падазраваных звузіўся да 20 афіцэраў, якіх перавялі на пасады, не зьвязаныя з апэрацыямі ў Расеі.




### «Крывавы Rick»

Перад гэтым Эймз здолеў выдаць у рукі расейцаў двух ключавых агентаў ЗША: высокапастаўленага чыноўніка контрвыведкі КДБ (крыптанім «Prologue») і расейскага атамнага спэцыяліста. Абодвух расстралялі. На амэрыканскіх банкаўскіх рахунках Эймза зьявіліся дадатковыя 278 тысячаў даляраў. Ён пачаў езьдзіць на вартым 40 тыс. даляраў «ягуары» і траціў 5 тысячаў даляраў штомесяц на пакупкі.

Адначасова Эймз пасьпяхова прайшоў у 1991 г. тэст на паліграфе (дэтэктары хлусьні), які кожны афіцэр ЦРУ абавязаны праходзіць што 5 гадоў. Ранейшы тэст 1986 г. ён таксама прайшоў без праблемаў. Гэта і нядзіўна: афіцэраў ЦРУ спэцыяльна вучаць, як праходзіць такія тэсты і ня даць сябе злавіць на хлусьні. Хутчэй за ўсё, Эймза дадаткова падрыхтавалі з гэтай мэтай і ў КДБ. Прынамсі два выкрытыя у ЗША шпіёны — чэскі агент перакладнік Карл Кёхер і кітайскі выведнік у ЦРУ Ву Тай Хін — таксама некалі ашукалі паліграфы агенцтва.

Пералом адбыўся ў кастрычніку 1992 г., калі Ольдрыч Эймз, вядомы сярод калегаў як Rick, паляцеў у Вэнэсуэлу на спатканьне з сваімі расейскімі босамі, сказаўшы начальству, што выпраўляецца ў Калюмбію. Гэтая простая памылка прывяла да таго, што за ім пачалі пільна прыглядаць. Летась у чэрвені быў учыненыператрус на ягоным працоўным мейсцы ў штаб-кватэры ЦРУ ў Ленглі, знойдзеныя дзясяткі дакумантаў, што мелі дачыненьне да Расеі, якімі Эймз, працуючы ў антынаркатычным аддзеле ЦРУ, ужо не павінен быў цікавіцца. Неўзабаве пасьля гэтага агенты ўламіліся ў ягоны дом, усталявалі «жучкі» і прагледзелі зьмесьціва ягонага кампутара.

### Таямнічая Разарыё

Толькі падчас шматмесячнага назіраньня выявілася, які па сутнасьці неабачлівы й легкадумны быў Rick Эймз. Агенты лёгка прачытвалі тэксты, якія ён перадаваў расейцам, з выкінутай на сьметніцу стужкі ад прынтара. Апрача таго, Эймз праз тэлефон размаўляў з жонкай пра пастаўленыя на скрынках кантактныя знакі, атрыманыя грошы, сустрэчы з расейскімі агентамі і г.д.

Са сваёй будучай жонкай Эймз пазнаёміўся ў 1981 г. у Мэксыцы. Ён завэрбаваў яе для працы ў ЦРУ, калі яна працавала аташэ па культуры ў амбасадзе Калюмбіі. Як афіцэр выведкі ён не павінен быў зьвязвацца з завэрбаванаю ім жа агенткай. Але на гэта ніхто не зьвярнуў увагі. Жыў ён тады ў раскошы. Разам з Разарыё яны часта бывалі на дыпляматычных прыёмах, выяжджалі на доўгія ўікэнды на марское ўзьбярэжжа, мелі шмат грошай.

Усё гэта скончылася, калі ў 1983 г. Эймза адклікалі ў ЗША. Разарыё паехала зь ім, хоць пры гэтым і страціла заробак супрацоўніцы калюмбійскай амбасады й грошы ад ЦРУ. Жыцьцё ў Вашынгтоне было надта дарагое, а Ольдрыч тады зарабляў ня болей за 50000 даляраў у год. У дадатак яму шмат каштаваў развод з былой жонкай, Нэнсі Джэйн Сэгебарт. 10 жніўня 1985 г., праз дзевяць дзён пасьля атрыманьня разводу, Ольдрыч і Разарыё ўзялі шлюб. У той самы год Ольдрыч пачаў працаваць на КДБ.

Ці завэрбавала яго Разарыё? Бальшыня экспэртаў у гэтым сумняваецца. Яна сама сказала ў момант арышту, што пра дзейнасьць мужа даведалася ў 1991 г. У адным зь перахопленых ФБР лістоў да КДБ Эймз напісаў, што жонка пра ўсё ведае і вельмі яму дапамагае. Дарэчы, амбасада Калюмбіі востра апратэставала абвінавачаньні, вылучаныя супраць Разарыё, а ў гэтай краіне распачалося асобнае дасьледаваньне.

Марыя дэль Разарыё Казас Эймз паходзіць з шанаванае калюмбійскае сям'і. Яе бацька быў сэнатарам. Яна скончыла самы прэстыжны ў сваёй краіне Андыйскі ўнівэрсытэт у Багаце, дзе потым выкладала клясычную філялёгію, тэорыю літаратуры й сучасную культуру. У Мэксыку яна паехала ў 1980 г., калі ёй было 28 гадоў. Невядома, што штурхнула гэтую маладую інтэлектуалку ў абдымкі ня надта кемлівага, нецікавага Эймза.

Былая пакаёўка Эймза Марыя Трынідад Чырына апісала Разарыё як непрыемную й нэрвовую асобу. Яна часта біла свайго сына Пола, якога Чырына забірала з сабой на цэлыя дні. З размоваў, запісаных ФБР, вынікае, што Разарыё патрабавала ад мужа, каб той быў больш асьцярожны і добра прыхоўваў прывезеныя з-за мяжы наяўныя. Пара мела дзьве кватэры і ранча ў Калюмбіі, адзін банкаўскі рахунак у гэтай краіне, адзін у Італіі, тры ў Швайцарыі і шэсьць у ЗША. Цяпер ФБР спрабуе замарозіць грошы Эймзаў, якія ляжаць у замежных банках, але Швайцарыя пакуль што адмаўляецца супрацоўнічаць.

З аднаго дакуманта, што трапіў у рукі ФБР, вынікае, што КДБ плаціла Эймзу 300 тысячаў даляраў штогод (у 4 разы болей, чым ЦРУ) і пералічвала яму дадатковыя сумы на замежныя рахункі. Толькі ў 1986-89 гг. Эймз атрымаў з Расеі 2,75 млн. даляраў. На працягу ўсяе шпіёнскае кар'еры ён мог зарабіць — як мяркуе кіраўнік сэнацкай камісіі па справах выведкі сэнатар Дэніс ДэКанчыні — нават 5 мільёнаў даляраў. Гэта было б утрая болей, чым расейцы калі-небудзь раней плацілі свайму агенту.

*(Працяг будзе)*

**Паводле замежнай прэсы падрыхтаваў Віктар ЛУК'ЯНАЎ**

# Ці застанецца Каралявец расейскім?

**Нагрувашчванне расейскіх войскаў, выведзеных з краінаў Балтыі, у Калінінградзкай вобласьці выклікае занепакоенасьць у Эўропе. З прычыны ўнутрыпалітычных супярэчнасьцяў расейскі ўрад зацягвае наданьне гэтай вобласьці статусу асаблівай эканамічнай зоны. Паглыбленьне крызы ў Калінінградзкай вобласьці пагражае дэстабілізаваць увесь балтыйскі рэгіён. Зьвязаныя з гэтым праблемы нядаўна абмяркоўваліся ў Эўрапарляманце.**

У адным з апошніх нумароў *Frankfurter Allgemeine Zeitung* зьявіўся падрабязны матар'ял на гэтую тэму. Як адзначаецца ў газэце, на спэцыяльным паседжаньні Эўрапарляманту ад нямецкіх сацыял-дэмакратаў выступіла сп-ня Гоф, якая заявіла, што шчыльнейшае супрацоўніцтва з Расеяй і суседнімі з Калінінградзкаю вобласьцю краінамі можа дапамагчы Эўрапейскаму Зьвязу пазьбегнуць канфліктаў у гэтым рэгіёне. Сябры Эўрапарляманту прапанавалі ўлучыць у пастаянную дамову ЭЗ аб супрацоўніцтве з Расеяй пункт пра магчымасьць для краінаў-удзельніц ЭЗ пашырыць гандаль ды іншыя сувязі з Калінінградзкаю вобласьцю. Парлямантары таксама прапанавалі заахвочваць Маскву даць мясцовым калінінградзкім уладам болей самастойнасьці ў правядзеньні перамоваў зь інстытуцыямі ЭЗ і міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі. Гэтую прапанову даволі крытычна ацаніў прадстаўнік Вялікабрытаніі ў Эўрапейскай Радзе сп. Мілян. На ягоную думку, выкананьне такіх плянаў Эўрапейскага Зьвязу занадта залежыць ад добрай волі Масквы.

Як адзначае *Frankfurter Allgemeine*, прадстаўніца нямецкіх сацыял-дэмакратаў мяркуе, што ЭЗ можа пакінуць за сабой у балтыйскім рэгіёне ролю пасярэдніка і пагаджальніка. Сп-ня Гоф лічыць, што затарможаны з прычыны нутраной палітычнай напружанасьці плян ператварэньня Калінінградзкай вобласьці ў свабодную эканамічную зону можа быць неўзабаве ажыцьцёўлены. Яна перакананая, што вобласьць не абыдзецца без замежнай дапамогі, бо мае слабаразьвітую гаспадарку, на ўтрыманьні якой «вісяць» 200 000 жаўнераў. Сп-ня Гоф мяркуе, што найперш трэба палепшыць інфраструктуру Калінінградзкай вобласьці, правесьці канвэрсію абаронных прадпрыемстваў і наагул інтэграваць яе эканоміку ў балтыйскі рэгіён.

Падчас дэбатаў некаторыя нямецкія парлямантары закранаалі пытаньне вяртаньня Караляўца Нямеччыне. Парлямантар Шаўтрух, аднак, заўважыў, што трэба больш зважаць на думку Масквы і не дапускаць, каб немцы ды расейцы сталіся падручнымі Польшчы й Летувы ў правядзеньні іхнай экспансіяніісцкай палітыкі. Прадстаўнік Рэспубліканскай партыі Крунд заявіў, што Кёнігзбэрг — сталіца нямецкай правінцыі Прусіі. Тымчасам сп-ня Гоф адзначыла, што краіны балтыйскага рэгіёну не жадаюць паўторнай германізацыі Караляўца. Яна таксама сказала, што нямецкі ўрад з гістарычных ды палітычных матываў ня хоча абмяркоўваць гэтае пытаньне і ўстрымліваецца ад інвэстыцыяў у гэтую вобласьць.

Іншы прадстаўнік нямецкіх сацыял-дэмакратаў папярэдзіў, што палітыкі, якія ўзьнімаюць пытаньне пра перакройваньне межаў, адбіваюць у Расеі ахвоту супрацоўнічаць з Захадам і сваім прыкладам натхняюць усіх тых, што мараць аб перагледзе пасьляваенных межаў.

**Падрыхтаваў Вінцук ШОСТКА**



© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

## «Ніхто, акрамя цябе»

**У вёсцы Ганчары Лідзкага раёну старая бабулька па штодзённай завядзёнцы глядзела сэрыял «Ніхто, акрамя цябе».**

Калі «дон Пэдра» ўчыніў чарговую мэлядраматычную сцэну, тэлевізар раптам ня вытрымаў і загарэўся. Гаспадыня кінулася гасіць, але не дала рады: сама апеклася і згарэў амаль увесь дом.

Г.А.

## Касінеры XX стагодзьдзя

**Жыхар Іўя спадар Дмухоўскі пасварыўся са спадаром Петрашом, які жыве паблізу на хутары.**

Дмухоўскі узяў запалкі, схапіў касу-літоўку для самаабароны ды паспрабаваў падпаліць Петрашову хату. Але, як той казаў, трапіўся востры на шылаватага. Гаспадар не разгубіўся і падстрэліў нядаку-падпальшчыка з дубальтоўкі ў нагу.

Не гуляйце, хлопцы, з запалкамі.

Г.А.

## Гісторыя КПСС і эротыка

**1 красавіка ў раскладзе заняткаў філфаку БДУ зьявілася лекцыя пад назовам «Палітыка і эротыка».**

Кажуць, што выкладчыца, якая „мелася“ яе чытаць, была ў шоку. І ня дзіва, бо да нядаўніх часоў ёй даводзілася распавядаць студэнтам толькі пра гісторыю КПСС.

В.М.

# Эпархіяльныя таямніцы

**Праваслаўнай ерархіі на Беларусі сьніцца «Русский государственный орел». Газэтку пад такім назовам распаўсюджвае разам з духоўнаю літаратураю катэдральны Сьвята-Духаўскі сабор у Менску. На першай старонцы выданьня распавядаецца, што тры кароны «олицетворяют триединство России — Украина, Белоруссия, Великороссия».**

Зьявіўся гэты «орел» у Менску ў патрэбны час, калі прэм'ер В.Кебіч пачаў мітусіцца з аб'яднаньнем грашовых сыстэмаў. Мітрапаліт Філарэт вельмі добра адчувае сытуацыю, бо, як сказала адна экстрасэнсарка, ён «мае трэцяе вока». Аднак «орел» мог зьявіцца ў сьвятыні не абавязкова з благаслаўленьня Ўладыкі, а проста з дазволу скарбніцы Сьвята-Духаўскай катэдры Аляксандры Монцік. Настаяцель храму Міхаіл Буглакоў па стане здароўя апошнімі гадамі амаль не зьяўляецца ў Катэдры, і тут фактычна кіруе скарбніца. Дзякуючы А.Монцік справы ў храме йдуць добра, хоць расцэнкі тут самыя высокія.

«Русский дух» у царкве ўмацоўваецца, нягледзячы на тое, што на Беларусі за даволі кароткі тэрмін зьявілася дзевяць архірэяў, што павінна было б сьведчыць пра большую самастойнасьць Беларускай праваслаўнай царквы. Пакуль што гэта прывяло толькі да павелічэньня колькасьці начальства, да пашырэньня штатаў, якія ўтрымліваюцца коштам вернікаў. Прычым становіцца ўсё больш відавочнай палітыка, скіраваная на выцясьненьне зь Беларусі архірэяў, на думку вернікаў, глыбока веручых і дастойных. Першай такой ахвярай быў япіскап Афанасі, былы вікары Мітрапаліта Філарэта. Цяпер ён стаў япіскапам Пермскім і Салікамскім. Нарадзіўся япіскап у Берасьці і вельмі смуткуе па сваёй Беларусі. Уладыка Афанасі ў Менску слыў таленавітым прапаведнікам, не займаўся палітыкай, цудоўна валодаў беларускаю моваю. Акрамя таго, любіў свой народ, і народ адказваў архірэю тым жа з удзячнасьцю. Няведама, што сталася прычынаю выгнаньня япіскапа Афанасія з нашае краіны. Магчыма, нехта ўбачыў у ім вельмі моцнага канкурэнта.

Другой ахвярай стаў архіяпіскап Гарадзенскі й Ваўкавыскі Валянцін, які цяпер таксама ў іншай краіне. Там ён узначаліў Стаўрапольскую духоўную сэмінарыю і атрымаў тытул архіяпіскапа Бакінскага. Наколькі мне вядома, высылка архіяпіскапа Валянціна выклікала ў царкоўным асяродку меншыя нараканьні, чымся высылка япіскапа Афанасія. Эпархіяльная ўправа адкрыта абвясьціла пра гэты факт, аднак нічога не было сказана пра прычыну высылкі Валянціна. Ёсьць вэрсія, што яго «зьела» кіраўніца Гарадзенскага Сьвята-Раства-Багародзіцкага манастыра з 11-ці манахіняў — 33-гадовая прыгажуня ігуменьня Гаўрыіла. Ніяк яна ня можа супакоіцца і праз сродкі масавай інфармацыі ўсё даказвае, што ейны манастыр па праву належыць праваслаўным, а не вуніятам. Магчыма, цяпер яна знойдзе спакой. Тымчасам Уладыка Філарэт узяў кіраваньне Гарадзенскаю катэдраю на сябе. Магчыма, ён будзе бліжэй і да дачы ў Сукневічах.

Іншых архірэяў перамяшчаюць толькі ў межах нашае краіны. Напрыклад, япіскап Дзьмітры быў пераведзены ў Віцебск з Полацка, дзе выклікаў сваім стаўленьнем да беларускае культуры абурэньне сярод інтэлігенцыі. Ягонае мейсца заняў япіскап Глеб, зь якім, на жаль, мне не ўдалося паразмаўляць. Бо праз тэлефон у Полацкай эпархіяльнай упраўе жаночы голас сьцьвярджаў, што «ўладыкі няма ў горадзе і ён моцна заняты». А праз хатні тэлефон адказалі, што ўладыка Глеб у Полацку, на службе ў царкве. Магчыма, ён валодае нейкімі незвычайнымі якасьцямі (патрэбна высьветліць у экстрасэнса).

Нягледзячы на тое, што ў Мітрапаліта Філарэта на Беларусі шмат справаў, дзевяць эпархіяў і да таго дэпутацкія абавязкі, ён між тым часта і падоўгу прападае ў Маскве. Дзеля чаго? Паспрабуем наступным разам пра гэта даведацца.

**Алесь ДАШЧЫНСКІ**




*Малюнак Лявона РАЗЛАДАВА*

# На вадзе папаўся

**Старшыня Каткоўскага сельсавету Глускага раёну Васіль Вабішчэвіч вырашыў за дзяржаўныя грошы палепшыць свой дабрабыт.**

За пракладку вадаправоду да ўласнай хаты ён расплаціўся бюджэтнымі сродкамі, аформіўшы паперы такім чынам, нібыта грошы пайшлі на «добраўпарадкаваньне тэрыторыі сельсавету». Людзі дачуліся пра гэта ды напісалі пракурору. Скончылася тым, што старшыню абавязалі вярнуць у сельсавецкі бюджэт блізу паўмільёна рублёў.

**Сяргей КАЗІМІРСКІ**

### Праграма 8-га каналу з 6 па 10 красавіка

**Серада, 6 красавіка**

18.00 Рэкляма.
18.05 Для дзяцей: «Карусэль», мультфільм «Шпінат для суслiка».
18.30 Муз. праграма. Рэкляма.
19.05 «Хіл-стрыт Блюз».
20.00 Мультфільм.
20.20 Сямейнае кола. Экспрэс-рэкляма.
20.25 «Швайцарскія рабінзоны». 8 сэрыя.
21.15 Стрэс-паўза.
21.20 «Залатая рука». Маст. фільм.
23.15 Муз. паўза.
23.25 Рэкляма.

**Чацьвер, 7 красавіка**

18.00 Рэкляма.
18.05 Мультсэрыял «Сям'я Барклі», мультфільм «Цар Мідас».
18.35 Муз. праграма.
19.05 Журфак БДУ прадстаўляе...
19.15 «Лябірынт правасудзьдзя».
20.05 Мультфільм.
20.25 ММ4 прадстаўляе: «Навіны».
20.40 Сямейнае кола.
20.45 «Лёс». 46 сэрыя.
21.25 «Файт». Спартовая праграма.
21.45 Справы надзённыя.
21.50 «Прыгоды Хаджы-Баба». Маст. фільм.
23.10 Муз. паўза.
23.25 Рэкляма.

**Пятніца, 8 красавіка**

18.00 Рэкляма.
18.05 Для дзяцей: «Карусэль», мультфільм «Дынапудзі».
18.30 «Солтэк» прадстаўляе: «Дорэміфасолькі».
18.35 Муз. праграма.
19.05 «Хіл-стрыт Блюз».
20.00 Мультфільмы.
20.20 Сямейнае кола.
20.25 «Швайцарскія рабінзоны». 9 сэрыя.
21.20 Час мясцовы.
21.40 «Непераможны Брус». Маст. фільм.
23.10 Муз. праграма.
23.25 Рэкляма.

**Субота, 9 красавіка**

15.00 Рэкляма.
15.05 Праграма пра здароўе «Жыцьцёвы выбар».
15.30 Муз. праграма.
16.00 ММ4 прадстаўляе: «Прапаведнік Кенэт Копленд».
16.30 Сямейны экран. «Вы і ня сьнілі». Маст. фільм.
18.05 Шалом зь Ерусаліма.
19.05 «Лёс». 47 сэрыя.
19.45 «Як маесься, дзядзька?». Крыстына Арбакайтэ.
20.15 Мультфільмы.
20.30 «Сьведка». Кароткаметражны фільм.
21.00 «Солтэк» прадстаўляе: «Спартовая мазаіка».
21.30 Сем хвілінаў з «Хрыстафорам».
21.40 «Амаль ты». Маст. фільм.
23.15 Муз. праграма.
23.25 Рэкляма.

**Нядзеля, 10 красавіка**

15.00 Рэкляма.
15.05 Спартовая паралель.
15.55 «Казань айца Міхала».
16.00 ММ4 прадстаўляе: «Нямецкая хваля».
16.30 «Затока Небясьпечная».
17.00 Асацыяцыя дзіцячай прэсы прадстаўляе: «БЭМЦ».
17.15 «Як маесься, дзядзька?». Гурт А-Студыя.
17.40 Мультфільмы.
18.00 «Солтэк» прадстаўляе: «Тэлефэн», «Вуліца».
18.30 ММ4 прадстаўляе: «Бізнэс-плян».
18.50 «Швайцарскія рабінзоны». 10 сэрыя.
19.20 «Схаваная камэра». Камэдыйнае шоў.
19.40 «Лёс». 48 сэрыя.
20.20 Роздум пра джаз.
21.15 Справы надзённыя.
21.25 «Напалеон». Маст. фільм.
23.20 Муз. паўза.
23.25 Рэкляма.

# НАША НІВА №3

«Тэмпэратура Крыві» — пад такімі словамі зьявіўся гэты нумар віленскай беларускай газэты «Наша Ніва». Тэма нумару — Югаславія. У Югаславіі ўсё як на Беларусі. Таксама славяне, адзін быццам народ, пацярпелы ад розных імпэрыяў, адна быццам мова, і — розныя веравызнаньні: праваслаўныя, каталікі... Але ў нас няма грамадзянскай вайны, а ў Югаславіі ёсьць. Чаму? Друкуюцца артыкул Энтані Сьміта «Паўставаньне нацыі», гутарка з харвацкім прафэсарам у рэдакцыі «НН», ліст сэрбскай пісьменьніцы, нататкі аглядальнікаў «НН».

«Ідэя Мёртвага Дому» — так называецца артыкул пра тое, як беларуская ідэя зь ідэі творчасьці паступова ператварылася ў знак руціны. Карані гэтага ператварэньня адшукваюцца ў самым пачатку беларускага руху XX стагодзьдзя.

Вялікі артыкул «Кніжны рынак у Ісьляндыі» выглядае на антыўтопію. Уявіце сабе ў Беларусі празьмерны рост маштабаў нацыянальнай кніжнай прадукцыі і народ, які зачытваецца біяграфічнымі раманамі пра Вольгу Корбут ці Мікалая Дземянцея...

Таксама ў гэтым нумары «НН» зьмешчаны новая аповесьць Адама Глёбуса, вершы Юрыя Гуменюка, страшнае апавяданьне Іўліна Ўо, шмат рэцэнзіяў, допісаў ды іншых матэрыялаў.


## Да ўвагі тых, хто пачынае ўласную справу

**Згуртаваньне беларускіх прадпрымальнікаў, Беларускі гуманітарны адукацыйна-культурны цэнтар, фірма «Асана» запрашаюць на курсы прадпрымальнікаў.**

**У праграме: асновы працоўнага й гаспадарчага заканадаўства, рынкавых дачыненьняў, мытнага заканадаўства, бугалтарскага ўліку, эканомікі прадпрыемстваў, рынку каштоўных папераў, падаткавай сыстэмы, навучаньне працы на кампутары.**

**Сярод выкладчыкаў — вядомыя беларускія навукоўцы й прадпрымальнікі.**

**Тэрмін навучаньня 2 месяцы. Навучаньне платнае.**

**Заняткі адбываюцца 2 разы на тыдзень у вечаровы час.**

**Пачатак заняткаў — па меры фармаваньня групаў.**

**Запрашаюцца асобы, якія маюць сярэднюю і вышэйшую адукацыю. Навучэнцы разьмяркоўваюцца па групах паводле ўзроўню іхнай пачатковай падрыхтоўкі.**

**Выпускнікам аказваецца дапамога ў рэгістрацыі ўласнага прадпрыемства.**

**Найлепшыя навучэнцы накіроўваюцца на стажаваньне ў краіны Заходняй Эўропы і ЗША да прадпрымальнікаў — прадстаўнікоў беларускай дыяспары за мяжою.**

**Заявы прымаюцца на адрас:**
**г.Менск, вул. Кірава, 21, пакой 6.**
**Тэлефон для даведак: 26-10-73 (зь 9 да 12 гадзін).**


# McDonald's баіцца Кебіча?

**Фірма McDonald's апублікавала пляны інвэстыцыяў ва Ўсходняй Эўропе. Да 1999 г. яна разьлічвае мець у гэтым рэгіёне блізу 650 рэстаранаў (пакуль што ёсьць толькі 39).**

Сёлета падвоіцца колькасьць рэстаранаў у Польшчы (да 20), у Вугоршчыне вырасьце з 17 да 25, у Чэхіі з 8 да 13, у Славеніі зьявяцца першыя два. У другой палове году McDonald's'ы адчыняцца ў Баўгарыі, Эстоніі і ў Летуве.

У першай палове 1995 г. гамбургеры McDonald's'а можна будзе купіць у Румыніі, а ў 1996 або 1997 г. — у Менску, Кіеве й Адэсе.

**Reuter**



Падпісны індэкс 63887. Нумар падпісаны ў друк 5.04.94. Друкарня "Беларускі Дом Друку" (Менск, пр. Ф.Скарыны, 79). Замова 467 Наклад 26 000.
п 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 м 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010